**УДК 94(476.5)**

# БАРАЦЬБА ГЛЕБА УСЯСЛАВІЧА (50-е гады XI ст. – 1119 г.) З УЛАДІМІРАМ МАНАМАХАМ (1053–1125 гг.)

***М.П. КРУПСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, праф. Д.В. ДУК)***

*Разглядаюцца этапы фарміравання Менскага ўдзелу. Адлюстроўваецца выключная роля Глеба Усяславіча і яго палітычная дзейнасць. У X – пачатку XI ст. Менск быў цэнтрам паўночнай групы дрыгавічоў, а затым адміністрацыйным і палітычным цэнтрам Менскай воласці. У 1020-я гады воласць перададзена ў склад Полацкага княства, у якім Менск, дзякуючы актыўнасці Глеба Усяславіча, фактычна з'яўляўся другім горадам пасля Полацка.*

У X – пачатку XI ст. Менск быў цэнтрам паўночнай групы дрыгавічоў, а затым адміністрацыйным і палітычным цэнтрам Менскай воласці, якая кіравалася ў пачатку з Турава, а затым з Кіева. У 1020-я гады воласць перададзена ў склад Полацкага княства, у якім Менск, дзякуючы актыўнасці Глеба Усяславіча, фактычна з'яўляўся другім горадам пасля Полацка. З канца XI ст. Менск – цэнтр удзельнага княства Полацкай зямлі. Першы менскі князь Глеб Усяславіч імкнуўся пашырыць свае ўладанні на ўсход і поўдзень, спрабуючы падпарадкаваць сабе надзелы і воласці з цэнтрамі ў Друцку, Оршы, Копысі і Слуцку. Пасля яго смерці ў 1119 г. Менскі надзел да 1146 г. часова адышоў да Кіева і перадаваўся вялікімі князямі кіеўскімі ў валоданне іх саюзнікам або канкурэнтам пры ўладжвання канфліктаў. Пасля зацвярджэння ў Менску сыноў Глеба і іх няўдалых спробаў заняць полацкі стол (1150–60-я гады), яны падпарадкоўваюць сабе суседнія Ізяслаўскае і Лагойскае ўдзельныя княствы, паклаўшы пачатак фарміраванню Менскай зямлі.

Цікавасць да асобы першага менскага князя Глеба Усяславіча ў мноства навукоўцаў тлумачыцца перш за ўсё актыўнай палітычнай дзейнасцю, што з’ўляецца своеасаблівым адлюстраваннем палітыкі яго знакамітага бацькі – Усяслава Брачыславіча (1044–1101 гг.).

Пераважная колькасць энцыклапедычных артыкулаў прысвечаных Глебу Усяславічу паведамляюць дастаткова кароткія звесткі пра яго жыццё і дзейнасць. Больш гістарычнай інфармацыі аб гэтым князі ўтрымліваецца ў абагульняючых работах па гісторыі Беларусі [1, с. 176–178; 2, с. 163–172].

Старажытнарускія летапісы не ўтрымліваюць інфармацыі пра час, месца і абставіны нараджэння Глеба Усяславіча. Мяркуецца, што ён мог быць трэцім па старшынстве з шасці сыноў Усяслава [3, с. 252]. Не выключана, што адным з двух сыноў Усяслава Брачыславіча, якія былі захоплены ў палон у ліпені1067 г. падчас перагавораў “на Рши у Смолиньска” разам са сваім бацькам, быў Глеб, які таксама правёў амаль 14 месяцаў у кіеўскім порубе. Можна меркаваць, што ў гэты час ён быў ужо ў юнацкам узросце, бо суправаджаў свайго бацьку падчас ваенных паходаў. Абсалютна лагічным можна лічыць дапушчэнне, што Глеб знаходзіўся побач з Усяславам як падчас яго сямімесячнага княжання ў Кіеве, так і падчас яго барацьбы за вяртанне ўлады ў Полацку ў 1060–70-я гады.

Старажытнарускія летапісы сведчаць, што князі маглі надзяляць сваіх сыноў удзеламі яшчэ пры жыцці, звычайна пасля шлюбу сына, альбо пасля дасягнення ім пэўнага ўзросту. Так, Глеб Усяславіч ажаніўся на дачцэ Уладзіміра – валынскага князя Яраполка Ізяславіча (сына вялікага князя Ізяслава Яраславіча, з якім Усяслаў Брачыславіч неаднаразова ўступаў у ваенныя канфлікты) Анастасіі Яраполкаўне (прыкладна каля 1074 – 8 студзеня 1159 г.). У далейшым Анастасія нарадзіла яму чатырох сыноў – Расціслава, Валадара, Усевалада і Ізяслава. Ускосным сведчаннем таму, што Глеб Усяславіч быў старэйшым за сваю будучую жонку, можа з’ўляцца тое, што яна перажыла яго на 40 гадоў, безумоўна, пры ўмове што смерць Глеба не была гвалтоўнай. Гэты шлюб хутчэй за ўсё з’ўляўся адлюстраваннем палітычнай гульні Усяслава Брачыславіча, які імкнуўся ўстанавіць саюзніцкія адносіны з Яраполкам Ізяславічам. Гэтым шлюбам Усяслаў Полацкі імкнуўся разбіць традыцыйны трыумвірат паўднёварускіх князёў, а памкненні да гэтага выразна прасочваюцца яшчэ ў 1073 г., калі Усяслаў Брачыславіч уступіў у перамовы з Ізяславам Яраславічам. Шлюб мог адбыцца да 1086 г., таму што 22 лістапада 1086 г. Яраполк быў здрадніцкі забіты. На падставе гэтай даты можна лічыць, што прыкладна ад 1085–1086 гг. мог ужо існаваць выдзелены Глебу Менскі ўдзел, які актыўна заявіў аб сабе толькі пасля смерці Усяслава Брачыславіча (1101 г.). Адсутнасць летапісных паведамленняў аб Менскай зямлі да 1101 г. можа тлумачыцца палітычным адзінствам Полацкага княства і правядзеннем агульнай знешняй палітыкі [4, с. 16].

Менск упершыню ўзгадваецца ў кантэксце бітвы на Нямізе 3 сакавіка 1067 г., якая адбылася паміж Усяславам Брачыславічам і трыумвіратам паўднёварускіх князёў Уладзіміравічаў. Д.С. Леанарда называе

бітву на Нямізе подзвігам жыхароў Менска, калі грамадзяне гэтага горада былі цалкам ахопленыя адным гарачым парывам: абараніць ад грознага замаху каштоўныя цэннасці свайго існавання, адстаяць свае неад'емныя правы на племянную самабытнасць, грамадзянскія свабоды і палітычную незалежнасць [5, с. 136–137].

Яшчэ адзін паход на Менск узгадваецца Уладзімірам Манамахам у яго “Павучанні”. З ліку таго, што гэтая сярэднявечная пісьмовая крыніца не мае датыроўкі падзей, зноў такі звяртаемся да В.Н. Тацішчава. Дзе можна датаваць дату першага паходу на Менск Уладзімірам Манамахам 1084–1085 гг.: “И на ту осень идохом с черниговци и с половци, с читеевичи, к Меньску изъехахом городъ, и не оставихом у него ни челядина, ни скотины…» [6]. Але цяжка сказаць адназначна паводле гэтага паведамлення, ці быў захоплены і спалены горад, ці была толькі абрабавана акруга і насельніцтва было ўведзена ў палон. Не выключана, што гэты разбуральны паход быў вынікам не толькі даўняга ваеннага змагання Полаччыны і Кіеўшчыны, але адначасова і ўсталяваўшыміся саюзніцкімі адносінамі паміж Усяславам і Яраполкам у выніку шлюбу Глеба і Анастасіі і выдзялення Глебу асабістага ўдзела. Адметна тое, што паход Уладзіміра Манамаха 1085 г. першапачаткова быў накіраваны супраць цесця Глеба – Яраполка Ізяславіча, які збег у Польшчу, і толькі потым супраць Менска [4, с. 16–17].

Глеб Усяславіч нападае на землі дрыгавічоў і смалян, якія на той час знаходзіліся пад уладай Святаполка Кіеўскага. У адказ на гэта Святаполк: “отправилъ въ 1104 году на Минскъ воеводу Путяту; къ кіевскому ополченію присоединились: смоленское подъ начальствомъ сына Владимира Мономаха Ярополка, Олегъ Святославичъ и братъ Глъба, Давидъ. Но соединенное войско возвратилось изъ Минской области без успеха” [7, с. 91; 8, с. 102].

Гэты паход узгадвае зноў такі сам Уладзімір Манамах у сваім "Павучанні": «И потом к Меньску ходихом на Глеба, оже ны бяше люди заялъ, и богъ ны поможе, и створихом свое мышленое» [6]. Як сведчаць паведамленні, гэты паход скончыўся безвынікова для заваёўнікаў, а значыць да гэтага часу Менск ператварыўся ў магутны горад, з моцнымі абарончымі збудаваннямі і баяздольнай дружынай, што і дазволіла паспяхова супрацьстаяць кааліцыйнаму паходу. Можна ўпэнена гаварыць аб тым, што за 20 гадоў валодання Менскам Глеб Усяславіч прыклаў значныя намаганні для развіцця горада і яго абароназдольнасці.

У 1106 г. Усяславічы сумесна выступілі супраць літоўскага племені земгалаў, якія жылі, па дадзеных хронік і старажытных геаграфічных карт, на поўдзень ад Заходняй Дзвіны, але пацярпелі жорсткае паражэнне, страціўшы каля 900 «дружины». Хоць летапісец і не называе канкрэтных удзельнікаў паходу, прысутнасць у аб'яднаным войску Усяславіча з менскай дружынай Глеба вельмі верагодна [9, с. 9].

Глеб Усяславіч імкнуўся пашырыць свае ўладанні перш за ўсё ў напрамку да Дняпра, адкуль адкрываліся перспектывы шырокіх сувязяў са знешнім светам. Гэта ў сваю чаргу абяцала эканамічную моц, упэўненае палітычнае становішча ўсёй Полацкай зямлі. У Аршанскім Падняпроўі інтарэсы Глеба Усяславіча сутыкнуліся з асабістымі інтарэсамі Уладзіміра Манамаха, які ў 1097 г. зноў узяў Смаленскае княства ва ўдзел. Уладзімір Манамах і яго нашчадкі намагаліся пашырыць тэрыторыю Смаленскага княства ў першую чаргу за кошт заходніх зямель, што належалі Полацкай зямлі ці знаходзіліся ў сферы яе інтарэсаў [1, с. 177].

Амаль адначасовае ўзвядзенне на левым беразе Дняпра на рубяжы XI–XII стст. парубежных крэпасцей сведчыць аб сутыкненні меж Полацкай зямлі і Смаленскага княства на Дняпры. Як бачна з летапісных паведамленняў, пад уладай менскага князя Глеба неўзабаве апынуўся г. Копысь [1, с. 177–178; 10, с. 265].

Звернемся да падзей 1116 г. асабістай увагі заслугоўвае паведамленне А.П. Сапунова: “Глъбъ Святославичъ Смоленскій повоева Дреговичи и Случескъ пожегъ, и не каяшеся о семъ; пойде же Володымеръ противу ему ко Смоленску, со сынами своими, и Давыдомъ Святославичомъ и Олговичи, и взя Вячеславъ Володымеричъ Оршу, Копылъ, а Давыдъ съ Ярополкомъ взяша Витепскъ, а Володымеръ пріиде къ Смоленску…” [11, с. 1]. Апісанне падзей не вызывае сумнення. Звесткі пра ўзяцце Давыдам і Яраполкам Віцебска, бясспрэчна вельмі важныя, але мала зразумела чаму А.П. Сапуноў узгадвае Глеба Святаславіча Смаленскага? Па-першае, на смаленскія землі нападаў усё ж такі Глеб Усяславіч Менскі. Па-другое, як мог смаленскі князь спусташать свае жа валоданні. І па-трэцяе, Глеб Святаславіч Смаленскі да гэтага часу (1116 г.) яшчэ не нарадзіўся, а жыў у смаленскай зямлі гэты ўладар каля 1355–1399 гг., у другой палове XIV ст. а не першай палове XII ст. А.П. Сапуноў абапіраецца на звесткі з Густынскага летапісу, але ўсё ж там адбылася блытаніна ў суаднясенні часа праўлення князёў. Таксама трэба ўзгадаць высновы Л.В. Аляксеева, якія ніякімі ссылкамі на летапісы не ўказаны, аб тым, што “в сообщении 1116 г. Смоленск ошибочно назван вместо Минска” [12, с. 197]. Калі даследчык адносіць

іх да паведамленняў В.Н. Тацішчава пад гэтай датай, усё ж такі там ідзе апісанне захопніцкіх намераў Глеба Усяславіча ў дачыненні да ўладанняў Уладзіміра Манамаха.

Сходу Менск узяць Уладзіміру Манамаху не змог, пасля чаго яшчэ некалькі месяцаў працягвалася аблога горада, у выніку чаго: "… Глѣбъ съ женою, дѣтьми и его вельможи, пришедъ ко Владимиру, въ собраніи всѣхъ князей просилъ прощенія. Владимиръ же взявъ отъ него объщаніе простилъ, и великой для нихъ пиръ учиня, и возвратя ему города его, со всѣми войски возвратился" [13, с. 217].

Трэба адзначыць, што Менск зноў не быў захоплены ў выніку асады і штурмаў, а быў наўмысна зданы Уладзіміру Манамаху. Абодва бакі пайшлі на стратэгічны кампраміс: Глеб прадэманстраваў пакорлівасць і захаваў большую частку сваіх уладанняў, а кіескі кіраўнік атрымаў Оршу і Копысь мірным шляхам. Акрамя таго, моцна пацярпелі друччане, частка жыхароў гэтага горада былі ўзяты ў палон Яраполкам і адведзены ў Пераяслаўскую вобласць, дзе быў пастроены для іх горад Жэлды [7, с. 92]. Магчыма, што падчас аблогі Менска Уладзімір Манамах і напісаў сваё "Павучанне", у якім паведамляў аб уласных шматлікіх паходах.

Аднак ужо ў 1119 г. Глеб Усяславіч ажыццяўляе новы паход сумесна з палачанамі "началъ воевать области Владимировыхъ дѣтей, Новогородскую (узнікае пытанне, так усё ж на Наўгародскую альбо Навагрудскую; "Новогородок" – Ноўгарад, альбо Навагрудак?) и Смоленскую" [13, с. 222]. На что ў адказ Уладзімір Манамах адпраўляе свайго сына Мсціслава Уладзіміравіча, які знішчае Менск, а самаго Глеба Усяславіча прывозіць да Уладзіміра, які пасадзіў яго ў кіеўскі поруб, дзе некалі сядзеў у кайданах разам з бацькам. Гісторыя паўтарылася не да канца: паўстанне не вызваліла вязня, вярнуцца на Полацкую зямлю яму не прыйшлося, у тым жа годзе (13 верасня 1119 г.) ён і памёр. Авалодаўшы Менскам, Уладзімір Манамах "…отдалъ его внуку своему Изяславу" [7, с. 93]. Што яшчэ больш пагоршыла адносіны паміж полацкімі і кіеўскімі князямі.

Такім чынам, са смерцю Глеба Усяславіча скончыўся адзін з найбольш яркіх і цікавых перыядаў ранняй палітычнай гісторыі Менска. Адсутнасць дастатковай колькасці пісьмовых крыніц ускладняе даследванне дадзенага перыяду ў гісторыі Полацкай зямлі. Між тым можна з упэўненасцю сцвярджаць, што перыяд княжання Глеба Усяславіча з'яўляўся часам найвышэйшай актыўнасці Менскага княства ў складаных сярэднявечных палітычных абставінах. Акрамя палітычнай палітыкі менскага князя, таксама трэба адзначыць і культурны ўклад "…Глеб…жертвует в монастырь (Кіева-Пячэрскі манастыр) 600 гривен серебра и 50 гривен золота, отстраивает для братии трапезную (1108 г.), а его вдова оставляет монастырю "все и до поя" [14, с. 254], а таксама пачатак будаўніцтва незавершанага храма ў Менску, які неаднаразова даследаваўся сучаснымі даследчыкамі [15, с. 118–121; 3, с. 203–207; і інш.].

У час найвышэйшага росквіту Менскага княства на ўсходзе межы дасягнулі Дняпра, на паўднёвым усходзе – нізоўяў Свіслачы, на поўдні – Случы.

ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2007. – Т. 1 : Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – 351 с.; іл.
2. Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь: Полац. і новагард. перыяды / М.І. Ермаловіч, прадм; М. Ткачова. – 2-е выд. – Мінск : Маст. літ., 2001. –366 с. : іл.
3. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля. (Очерки истории Северной Белоруссии). В IX–XIII вв. / Л.В. Алексеев. – М. : Наука. 1966. – 295 с., ил.
4. Кошман, В.І. Глеб Усяславіч Менскі ў святле гістарыных і археалагічных крыніц / В.І. Кошман // Матэрыялы па археалогіі Беларусі / Нац. акад. навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – 2012. – Вып. 23 : Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў 2009–2010 гадах [уклад.: А.М. Мядзведзеў, В.Л. Лакіза. – 384, [3] с.
5. Леонардов, Д.С. Полоцкій князь Всеславъ и его время. (Продолженіе) / Д.С. Леонардов // Полоцко-Витебская старина / Витебская ученая, архивная комиссія. Типо-Лит. Насл. М.Б. Неймана. – Витебскъ, 1916. – Вып. III. – С. 87–180.
6. Изборник (Сборник произведений литературы Древней Руси) [Электронный ресурс]. – М. : Худож. лит., 1969. – С. 146–171, 709–713 (прим.) – Сер. «Библиотека всемирной литературы». Подготовка текста «Поучения…», перевод и примечания Д.С. Лихачева. – Рэжым доступу: http://www.monomah.vladimir.ru/pouchenie.htm. – Дата доступу: 01.03.2013.
7. Довнар-Запольский, М.В. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия / М.В. Довнара-Запольский. – Киев : Типолитогр. Т-ва И.Н. Кушнерев и К в Москве. Киев. отд-ние, 1891. – VI, 170 с.

8. Полное собрание русских летописей. – Ленинград : Наука, 1989. – Том 38 : Радзивиловская летопись. – 177 с.
9. Чаропка, В.К. Імя ў летапісе / В.К. Чаропка ; прад. А.М. Сідарэвіча; маст. А.А. Александровіч. – Мінск : Полымя, 1994. – 559 с. : іл.
10. Голубовскій, П.В. Исторія Смоленской земли до начала XV ст. : моногр. / П.В. Голубовскій. – Кіевъ : Типогр. Императорскаго Университета им. Св. Владиміра, 1895. – 334 с.
11. Сапунов, А.П. Витебская старина. Съ приложеніями и рисунками в текстъ / сост. и изд. А. Сапуновъ. – Витебскъ : Тип. губернского правленія, 1883. – Т. 1. – 668 с. ; ил.
12. Алексеев, Л.В. Смоленская земля IX–XIII вв. Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии / Л.В. Алексеев. – М. : Наука, 1980. – 261 с.
13. Татищевъ, В.Н. Исторія Россійская съ самыхъ древнейшихъ временъ неусыпными трудами черезъ тритцать лѣтъ собранная и описанная покойнымъ тайнымъ совѣтникомъ и Астраханскимъ губернаторомъ Васильемъ Никитичемъ Татищевымъ. Книга вторая. Напечатана при Императорскомъ университетѣ, 1773 г. – 536 с.
14. Дмитриева, Р.П. Сказание о князьях Владимирских / Р.П. Дмитриева : отв. ред.: чл.-корр. АН СССР Д. С. Лихачёв. – М. ; Ленинград : Изд-во Академии наук СССР,1955. – 213 с.
15. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры : в 2 кн. / Л. В. Алексеев; Ин-т археологии РАН. – М. : Наука, 2006. – Кн. 1. – 289 с.